ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1986
15
МАЯ
№ 17 (1503)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

Беларускі універсітэт

ТЭЛЕТАЙП

«УЧОРА · СЁНЯ · ЗАЎТРА»

ЭКЗАМЕН

на працоўную загартоўку, грамадзянскую сталасць рыхтуюцца па-сур'ёзнаму здаваць першакурснікі фізічнага факультэта, якія вырашылі сваё першае студэнцкае лета правесці ў СБА «Пульс». Усе студэнты актыўна ўдзельнічаюць ва ўсіх мерапрыемствах падрыхтоўчага перыяду. Кожны баец прайшоў курс навучання па тэхніцы бяспекі.

Згуртоўвае байцоў СБА «Пульс» і сумесная праца на суботніках. Яны працавалі ў дзіцячым садзе № 241, на эксперыментальнай базе «Курасоўшчына». Грошы, зароблены на суботніку, вырашылі перадаць у фонд «Чырвонага Крыжа».

Кіпіць і арганізацыйная работа «Пульса». Студэнты старанна афармляюць куткі па ТБ і ганаровага байца. А ім выбраны Герой Савецкага Саюза Мікалай Чэпік.

Рыхтуюцца лектары, не сціхаюць вясёлыя галасы, калі збіраецца агітбрыгада. «Ад нас самі залежыць, якім стане лета-86»,— гаворыць камандзір Святлана Голубева, камісар Дзмітрый Хільмановіч, байцы Ігар Іваноў, Ірына Гарудка і іншыя.

Л. ГЛУШКО,
баец СБА «Пульс».

АДКРЫЛІСЯ

курсы «Актуальныя праблемы палітэканомii» павышэння кваліфікацыі замежных грамадзян — выкладчыкаў палітэканомii. На працягу месяца слухачы курсаў атрымаюць грунтоўную падрыхтоўку аб развіцці палітычнай эканомii на сучасным этапе. У праграме: сустрэчы з вучонымі універсітэта, АН БССР, дыскусii за «круглым сталом», паездкі па рэспубліцы.

А. СЦЯПАНАЎ.

У ЖЫЦЦІ ЗАЎСЁДЫ ЁСЦЬ МЕСЦА ПОДЗВІГУ

— у гэтым яшчэ раз пераканаліся байцы СБА «Алеся» I курса юрыдычнага факультэта на радзіме Героя Савецкага Саюза Мікалая Чэпіка.

Урачыста і ціха ішлі камсамольцы па дарозе ў вёску Блужа. Бо па ёй зусім нядаўна хадзіў чалавек, які назаўсёды застаўся ў памяці людзей. Студэнтаў сустрэлі вучні школы, якой цяпер прысвоена імя героя, потым адбыўся мітынг ля абеліска сяльчанам, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. Наведалі таксама музей імя Мікалая Чэпіка.

Удзячная памяць застанецца ў студэнтаў назаўсёды.

І. БУЛАШ.

ТРАДЫЦЫЙНЫ ІХ ЗЛЁТ ФІЛОЛАГАЎ

адбудзецца ў гэту суботу на радзіме Я. Купалы ў Вязынцы. Яго ўдзельнікаў чакае разнастайная цікавая праграма. Аб тым, як яна складвалася, чытайце наш фотарэпартаж у наступным нумары.

Г. ЮРЧАНКА.

Рашэнні XXVII з'езда КПСС — у дзеянні!

ПАЗІЦЫЯ — АКТЫЎНАЯ

ГАВОРАЦЬ, у Веранікі Бурш, студэнткі III курса VI групы хімфака заўсёды добры настрой. А значыць, усмешка на твары.

Мусіць так і павінна быць у чалавека, які адказвае за настрой сваіх таварышаў-студэнтаў. Вераніка — прафорг групы. І, вядома, у гэтай галіне ў студэнтаў — мора пытанняў. Жыллё, матэрыяльная дапамога, пуцёўка...

Толькі чалавек з аўтарытэтам і ўсмешкай можа рашыць іх.

Фота А. ВАЛОШЫНА.

ГОД 1986 — МІЖНАРОДНЫ ГОД МІРУ

«МЫ ВУЧЫМСЯ Ў КРАІНЕ СЯБРОЎ»

Іх некалькі соцень юнакоў і дзяўчат — пасланцоў розных краін з пяці кантынентаў планеты. Тут, у сталіцы Савецкай Беларусі, горадзе-герої Мінску, яны набываюць прафесii інжынераў і ўрачоў, педагогаў і журналістаў. Адкуль бы яны ні прыехалі да нас на вучобу: ці то з далёкай Афрыкі, ці з суседніх нам брацкіх краін сацыялізму — іх усіх аб'ядноўвае пачуццё гонару, што яны маюць магчымасць жыць і вучыцца ў Краіне Саветаў, створанай вялікім Леніным. У краіне, якая з першага дня свайго існавання абвясціла поклічны і самы гуманны дэвіз: «Мір — народам!»

Вернасць гэтаму ленінскаму прынцыпу — жыць у міры і дружбе з вялікімі і малымі народамі свету — наша краіна захоўвае пастаянна. Вось і цяпер, у гэтыя веснавыя дні, з высокай трыбуны партыйнага форуму зноў страсна прагучаў яе заклік: да свету без ядзернай зброі, без войнаў!

Ніжэй мы публікуем некалькі інтэрв'ю нашых няштатных карэспандэнтаў з замежнымі студэнтамі аб тым уражанні, якое зрабілі на іх новыя мірныя прапановы Савецкага Саюза ў гэтым годзе — Міжнародным годзе міру.

Мірка Пышкава (ЧССР), студэнтка аддзялення філасофii:

— З цікавасцю сачыла за работай XXVII з'езда КПСС. Асабліва мяне радавала тое, што гэты форум вашай ленінскай партыі ўдзяліў вялікую ўвагу развіццю далейшай дружбы паміж краінамі сацыялістычнай садружнасці. Іменна дзякуючы гэтай дружбе я маю магчымасць вучыцца ў цудоўным Мінску. У мяне тут з'явілася многа добрых сяброў, і не толькі сярод савецкіх студэнтаў, з якімі я разам жыву ў інтэрнаце і займаюся на адным факультэце, але і з іншых краін — рэвалюцыйнай Нікарагуа і далёкага горнага Непала, з Іспаніі і Амана. У нас, студэнтаў з Чэхаславакii, завязалiся цесныя сувязі з маладымі рабочымі падшыпнікавага завода. Там мы даём урокі чэшскай мовы і ў той жа час самі знаёмімся з цікавай работай, жыццём і адпачынкам маладых завадчан.

Карацей кажучы, я ганаруся тым, што ўношу свой сціплы ўклад у вялікую дружбу паміж нашымі дзвюма краінамі.

Гебрэмарыям САЛАМОН (Эфіопія), факультэт журналістыкі:

— Гэты год ААН аб'явіла Міжнародным годам міру. Усе мы з'яўляемся сведкамі новых мірных ініцыятыў Савецкай дзяржавы: прадоўжання мараторыя на тры месяцы, праграмы поўнай ліквідацыі ядзернай зброі да 2000 года. Гэтыя прапановы маюць жыццёва важнае значэнне не толькі для вядучых дзяржаў, але і для маладых краін, што сталі на шлях развіцця. Колькі людзей там галадаюць і паміраюць ад хвароб. Сродкі, што ідуць на стварэнне смяротнай зброі, можна было б выкарыстаць на іх выратаванне, на дабрабыт усіх народаў. Толькі ліквідацыя ядзерных арсеналаў, чаго дамагаецца Савецкі Саюз, ахавае чалавецтва ад сусветнай катастрофы, небяспека якой навісла над планетай.

Хочацца сказаць і пра вернасць краіны Леніна свайму інтэрнацыянальнаму абавязку. Яна аказвае бескарыслівую дапамогу ўсім маладым краінам і народам. І асабліва не пакідае іх у дні стыхійных бедстваў. Так было ў час вывяржэння вулкана ў Калумбіі і землетрасення ў Мексіцы. Так было і паўгода назад, калі тэрыторыю васьмі афрыканскіх краін, у тым ліку і маю радзіму, напаткала страшэнная засуха. З Савецкага Саюза ў Афрыку былі дастаўлены неабходныя матэрыялы, прадукты харчавання, медыкаменты, тэхніка. Прыляцелі савецкія ўрачы, медсёстры, вадзіцелі, лётчыкі. Яны выратавалі тысячы людзей.

Увогуле, мае землякі штодзённа адчуваюць надзейную руку дружбы савецкага народа. Дзякуючы гэтай дружбе ў нас пабудаваны зборачна-трактарны завод, над якім узялі шэфства мінскія трактарабудаўнікі, узводзіцца буйная ГЭС. Савецкі Саюз пастаўляе нашым прадпрыемствам рознае абсталяванне, прысылае сваіх спецыялістаў і прадастаўляе ўсе ўмовы, каб мы набылі тут выбраныя спецыяльнасці.

Сахар Абу Хіджэлех ІМРАН (палесцінка), факультэт журналістыкі:

— Я даўно марыла аб тым, каб паехаць на вучобу ў Савецкі Саюз. Марыла як аб вялікім шчасці. І гэта мая мара збылася. Мне далі стыпендыю, я паступіла на факультэт, які выбрала сама. І ўбачыла тое, аб чым чула на радзіме: у Савецкім Саюзе ўсе людзі маюць работу, роўныя правы ў мужчын і жанчын. Асабліва мяне здзівілі спачатку жанчыны — вадзіцелі тралейбусаў.

Цяжка было размаўляць на рускай мове. Але савецкія студэнты, якія жывуць з намі, дапамагалі авалодаць мовай.

У Мінску вучыцца 160 маіх землякоў. Мы часта выступаем перад студэнтамі і школьнікамі, знаёмім іх з нашымі нацыянальнымі традыцыямі, расказваем пра мужную барацьбу нашага народа за вызваленне сваёй радзімы.

Тут, у Савецкім Саюзе, мы не толькі авалодваем прафесіяй, мы вучымся будаваць жыццё. Мы вельмі высока ацэньваем рашэнні XXVII з'езда КПСС аб далейшым удасканаленні сацыялістычнага грамадства і ўпэўнены, што савецкі народ зможа вырашыць пастаўленыя задачы. Галоўнае — захаваць мір. І ўсе савецкія прапановы накіраваны іменна на ўмацаванне міру.

Гіта ШРЭСТХА (Непал):

— Наша краіна — невялікая. Яна знаходзіцца ў гарах, паміж Індыяй і Кітаем. У палітычных адносінах яна прытрымліваецца нейтралітэту. Але калі размова заходзіць аб такім пытанні, як захаванне міру і выратаванне ўсяго чалавецтва, наш народ цалкам падтрымлівае праграму ліквідацыі ядзернай зброі, якую прапануе Краіна Саветаў.

Інтэрв'ю правялі В. ЖАРЫНА, А. ЗЯНКЕВІЧ, студэнткі факультэта журналістыкі.

ВЕДАМ — ЯКАСЦЬ!

А ЛЕКЦЫЮ «САЧКАНУ»!

ПАЛЕМІЧНЫЯ НАТАТКІ СТУДЭНТА СА СТАЖАМ

ГЭТЫЯ СЛОВЫ, якія часта можна пачуць у студэнцкіх аўдыторыях, вынесеныя ў загаловак газетнага матэрыялу, будуць успрымацца некаторымі як амаль ерэтычныя. Але што зробіш? Як пісаў А. Аграноўскі ў адным са сваіх нарысаў, студэнт, які не прагульвае лекцый, — гэта восьмы цуд свету. Я, зразумела, не буду пець дыфірамбы прагульшчыкам — проста прапаную паразважаць, чаму студэнты прапускаюць лекцыі. На гэту тэму можна было б напісаць цэлы трактат — настолькі яна шырокая, таму мы закранаем толькі асноўныя бакі пытання. Загадзя папярэджваю, што не будзем мець на ўвазе «свядомага» прагульшчыка, для якога галоўнае — не веды, а дыплом. Такіх студэнтаў няшмат: большасць імкнецца да таго, каб атрымаць трывалыя веды і стаць высокакваліфікаванымі спецыялістамі.

Кожны, хто вучыўся ў ВНУ, можа ўспомніць, што на лекцыі аднаго выкладчыка студэнты літаральна «заганяюцца» пад пагрозай пазбаўлення стыпендыі (і ўсё роўна ходзяць лічаныя людзі: звычайна заводзіцца чарга, каб на некалькі чалавек мець для экзамена адзін канспект — выкладчык патрабуе адказваць, як ён «даваў»), а на лекцыі другога ходзяць усе да аднаго. Першы выкладчык рэгулярна адзначае адсутных, а той, хто прапусціць хаця адну пару, заносіцца ў «чорны спіс» — потым, на экзамене, яму ўсё прыпамінаецца: зніжаецца на бал адзнака, задаюцца дадатковыя пытанні «на засыпку», патрабуецца прад'яўленне поўнага канспекта лекцый і рэфератаў па прапушчаных тэмах. І ўсё ж «чорны спіс» становіцца з кожным днём усё даўжэйшым, бо лекцыі нецікавыя, проста апісальныя, цалкам паўтараюць падручнік.

У артыкуле «Настаўнік, вучыся!» А. В. Луначарскі пісаў: «...настаўнік не толькі павінен добра ведаць тое, што ён выкладае, але павінен яшчэ выдатна ведаць, як гэта выкладаць». Лекцыя — галоўная форма вучобы ў ВНУ; вучоба — наш галоўны абавязак, таму кожную лекцыю мы павінны старацца добра засвоіць. Але як кантралюецца якасць лекцый?

Неяк у «Правде» быў надрукаваны артыкул рэктара металургічнага інстытута з г. Жданава Н. Жажаленкі «Экзаменуе аўдыторыя». Цытую: «Сярод работнікаў вышэйшай школы, радавых і кіруючых, нямала яшчэ такіх, хто з недаверам адносіцца да студэнцкай самастойнасці. Не, яны не супраць, напрыклад, удзелу студэнтаў у абмеркаванні дысцыпліны. Але катэгарычна пярэчаць, каб размова ішла пра ацэнку студэнтамі работы выкладчыка. Ці педагагічна гэта? — гаворыцца звычайна ў гэтых выпадках. Наш вопыт сведчыць: тут праяўляецца перш за ўсё недавер'е да розуму, назіральнасці і сумленнасці будучых спецыялістаў. І яшчэ — педагагічныя амбіцыі, нежаданне выкладчыка даведацца пра свае недахопы».

Як бачыце, на гэты раз не студэнты, а выкладчыкі прапануюць, каб адзнаку за якасць лекцый ставілі студэнты. Учора мы з сябрамі падлічылі ўсе аргументы, якія галасуюць «за» гэту прапанову: студэнты слухаюць усе лекцыі цыкла, таму ведаюць, як даецца дысцыпліна ў цэлым, яны могуць падказаць выкладчыку аптымальны варыянт падачы матэрыялу. Ды і ўсім зразумела, што калі лекцыю правярае хтонебудзь з начальства, то выкладчык стараецца прачытаць яе лепш, чым заўсёды.

У заключэнне адважуся напомніць: даследаванні паказалі, што сучасны студэнт працуе над засваеннем матэрыялу ў 1,5 раза больш, чым студэнт 20—30-х гадоў. Калі ў цэлым па Савецкаму Саюзу працоўны дзень значна памяншаецца, то ў студэнтаў ён узрастае і разам з аўдыторнымі заняткамі перавышае 8—9 гадзін. А, напрыклад, у Будапешцкім эканамічным універсітэце імя К. Маркса час абавязковых заняткаў зменшаны да 22—25 гадзін у тыдзень у параўнанні з 28—32 гадзінамі. У выніку вызваліўся цэлы дзень для самастойнай вучобы і навуковай работы, для наведвання цікавых заняткаў на іншых факультэтах. Хіба няма сэнсу пераняць добры вопыт? Рэзервы? Калі ласка: калі ёсць добры, грунтоўны падручнік па вывучаемай дысцыпліне, навошта слухаць і канспектаваць яго пераказ? Ці не лепш было б цыкл лекцый па гэтай дысцыпліне скараціць, прысвячаць аўдыторныя заняткі толькі праблемным пытанням, асаблівую ўвагу звяртаць на так званыя «белыя плямы» — на тое, што яшчэ не адкрыта ці дрэнна вывучана? На лекцыі студэнты будуць прыходзіць падрыхтаванымі ўжо, змогуць смела выказваць уласныя гіпотэзы і меркаванні. Гэта і будзе сапраўднае праблемнае навучанне, імкненне да таго, каб, па словах М. І. Калініна, «студэнты самі ўмелі фармуляваць свае думкі, каб яны аперыравалі самастойна сваім разумовым багажом, а не цытавалі толькі па кніжках».

Т. ПАДАЛЯК,
студэнтка 5-га курса факультэта журналістыкі.

МАЦАВАЦЬ ТРАДЫЦЫІ

Не толькі па кнігах

вывучаюць гісторыю роднага краю і журналістыкі студэнты журфака. У гэтым навучальным годзе на факультэце стала добрай традыцыяй праводзіць у інтэрнаце, дзе жывуць студэнты, дні кафедр. Напярэдадні ўсенароднага Свята Перамогі выкладчыкі кафедры гісторыі журналістыкі і студэнты сабраліся ў ленінскім пакоі інтэрната № 2. Цёпла віталі прысутныя ганаровых гасцей — ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны загадчыка кафедры гісторыі журналістыкі прафесара Р. В. Булацкага і журналіста Я. І. Качана. Успаміны былых воінаў, іх яркі, усхваляваны расказ аб падзеях апошняй вайны зноў уваскрэсілі тыя незабыўныя дні.

Шмат баявых узнагарод мае прафесар Р. В. Булацкі, які ў гады вайны служыў у авіяцыі. Рыгор Васільевіч нагадаў некалькі выпадкаў з асабістай баявой біяграфіі, цёплым словам успомніў сваіх сяброў-лётчыкаў, мужнасць і гераізм якіх набліжалі майскі дзень 1945 года.

Якаву Іосіфавічу Качану, які прайшоў выдатную журналісцкую практыку ў «Звяздзе» і «Советской Белоруссии», у ваенныя гады давялося працаваць у тыле ворага. У якасці карэспандэнта тагачаснай газеты «Малады партызан» Я. І. Качан выконваў баявыя заданні, быў у гушчыні партызанскага руху. Ён змагаўся і словам, і аўтаматам. Якаў Іосіфавіч расказаў аб тым, як выходзіла газета ў ваеннай абстаноўцы. Не хапала паперы, прыходзілася выкарыстоўваць вучнёўскія сшыткі, пакаёвыя шпалеры. Нягледзячы на цяжкасці, газета выходзіла, трапляла да людзей.

У заключэнне дацэнт кафедры гісторыі журналістыкі А. І. Раковіч сардэчна падзякаваў ветэранам за цікавую гутарку, павіншаваў усіх са Святам Перамогі і выказаў маркаванне, што і ў будучым неабходна замацаваць добрую традыцыю. Усхваляваныя, пакідалі савецкія і замежныя студэнты ленінскі пакой, бо ў сэрцы кожнага засталася часцінка нашага гераічнага мінулага.

Н. ПУЗІК,
студэнтка факультэта журналістыкі.

НА ЗДЫМКАХ: у час сустрэчы.

ШТО МОГУЦЬ ДАЗОРНЫЯ?

Сярод грамадскіх арганізацый народны кантроль займае асаблівае месца. У кожным калектыве яму належыць роля кантролю і прафілактыкі. Таму арганізацыя работы групы народнага кантролю, якая мае сваю спецыфіку ў ВНУ, ёсць адна з важнейшых умоў яе функцыяніравання.

ВОПЫТ ЛЕПШЫХ — УСІМ

У ГЭТЫХ адносінах цікавы вопыт работы ГНК фізічнага факультэта, які з'яўляецца пераможцам сацыялістычнага спаборніцтва сярод факультэтаў і падраздзяленняў БДУ імя У. І. Леніна.

У структуру ГНК фізфака ўваходзяць 4 сектары: арганізацыйны, матэрыяльна-бытавы, навуковай і вучэбнай работы, дзе працуюць 12 кантралёраў. У асноўным народныя дазорныя маюць вялікі стаж работы. Сярод актывістаў можна назваць загадчыкаў вучэбных лабараторый А. П. Нячай, Л. Г. Цегіна, дацэнта Л. В. Качарскую, старшага інжынера А. Ф. Сышчанку. Узначальвае дзейнасць групы старшы навуковы супрацоўнік В. М. Чумак, які з'яўляецца адначасова членам партбюро факультэта. Група цесна ўзаемадзейнічае з прафсаюзным бюро, «Камсамольскім пражэктарам» студэнтаў, камісіяй партбюро па кантролю дзейнасці адміністрацыі.

Старшыня групы Вячаслаў Міхайлавіч Чумак падзяліўся сваімі думкамі, адказаў на некалькі нашых пытанняў.

— Народны кантралёр — пасада ганаровая і адказная. Наколькі дзейнасць групы НК залежыць ад падбору кадраў?

— Адкажу словамі, некалі стаўшымі крылатымі: «Кадры рашаюць усё». Безумоўна, правільны падбор, расстаноўка і арганізацыя работы народных кантралёраў — галоўнае ў нашай дзейнасці. Бо рэкамендаваны калектывам народны кантралёр павінен быць сам узорам. Ён павінен быць прыкладам на працоўным месцы, добрасумленна выкрываць недахопы, ускрываць прычыны іх і знаходзіць шляхі ліквідацыі. А самае галоўнае — гэта выкрыць «цяжкія», слабыя месцы, якія перашкаджаюць калектыву папярэдзіць парушэнні. Як і ў кожнай справе, кантралёр вучыцца працаваць. Для гэтага праводзяцца заняткі ў школе НК. Абавязковае патрабаванне да ўсіх дазорных — даводзіць праверкі да завяршаючага рэзультату. У нашай групе працуюць вопытныя людзі, якія перадаюць свае веды маладым.

— Шмат часу прыходзіцца на «папяровую» дзейнасць. Ці не перашкаджае гэта рашэнню асноўных праблем?

— Калі падыходзіць да работы нефармальна, то не перашкаджае. Растлумачу. Пасяджэнні групы, якія праходзяць падзелавому, пратакаліруюцца хутчэй для канкрэтнасці і ўзгодненасці дзеянняў, чым для справаздачы. Дакументацыя, якая складаецца па праверках, самі разумееце, не шкодзіць. Усё павінна быць у разумных межах.

— Кантралёр са стажам, вопытны кантралёр. Якімі якасцямі павінен валодаць чалавек, каб дамагчыся поспеху ў сваёй дзейнасці?

— Уменне эфектыўна праводзіць праверкі, імкненне да выкаранення недахопаў, уменне бачыць не толькі кепскае — патрабуюць ад кантралёра аб'ектыўнасці, сумленнасці, добразычлівасці і патрабавальнасці.

— Мы з'яўляемся сведкамі і ўдзельнікамі пазітыўных перамен у жыцці калектываў. Якую ролю ў гэтым іграюць ГНК?

— Важнае значэнне ў рабоце групы НК адыгрывае перабудова па паскарэнню навукова-тэхнічнага прагрэсу. Для фізічнага факультэта — гэта павышэнне эфектыўнасці НДР, выкарыстання абсталявання і г. д. Важным момантам з'яўляецца працоўная і выканаўчая дысцыпліна супрацоўнікаў, якой ГНК надаецца вялікая ўвага.

— Што б Вы пажадалі адстаючым? З чаго пачаць і як арганізаваць працу, каб яна была дзейснай?

— Важным у дзейнасці ГНК з'яўляецца правільнае вызначэнне асноўных напрамкаў праверак. У гэтым дапамогуць выступленні камуністаў, членаў калектываў на сходах, вытворчых нарадах. Правядзенне праверак павінна быць якасным і эфектыўным. І нарэшце, вельмі важна, каб была належная публічнасць дзейнасці.

А. КОНАНАВА.
член аддзела арганізацыйнай работы КНК універсітэта.

КУРСАМ ПАСКАРЭННЯ НТП

КОЛЬКІ ЧАКАЦЬ ПАСРЭДНІКА?

АТНС: ПРАБЛЕМЫ ЎКАРАНЕННЯ

ЯКАСЦЬ падрыхтоўкі ў ВНУ — як яе палепшыць? Чаму ў гэтай справе такія марудныя тэмпы? Адказ часткова можна знайсці ў адносінах студэнтаў да заняткаў. І вось з якога боку. Выпадковых людзей не так ужо багата ў аўдыторыях. Значна большая частка студэнцтва — учарашнія школьнікі. Добрасумленнасці і ўвагі ім не пазычаць. І ўчарашні школьнік жадае атрымаць тут значна больш, чым проста веды, ды і ў другой, цікавейшай форме. На самай жа справе форма падачы матэрыялу мала чым адрозніваецца ад традыцыйнай, школьнай. Адсюль губляецца яскравы інтарэс да авалодання ведамі. Хапае яшчэ сумных, маркотных лекцый — хто з імі не сустракаўся?

А што, калі ў адпаведнасці з часам, патрабаваннямі навукова-тэхнічнага прагрэсу абнавіць форму выкладання? Паставіць, напрыклад, паміж студэнтам і выкладчыкам пасрэдніка — машыну! Так і зрабілі ў адзінкавых выпадках. Толькі ў адзінкавых. Складанасць у тым, што метад гэты не атрымлівае шырокага распаўсюджвання. І прычын тут шмат...

За прыкладам далёка хадзіць не трэба. Вось адзін з іх. АТНС — аўтаматызаваная тэлевізійная навучальная сістэма. Распрацавана ў НДІ прыкладных фізічных праблем імя А. Н. Сеўчанкі і на кафедры электронна-матэматычных машын. Аўтары гэтай работы ў 1984 годзе сталі лаўрэатамі прэміі Савета Міністраў СССР. АТНС — гэта 16 экранных пультаў. Кожны пульт — гэта дысплей, які складаецца з клавіятуры і малагабарытнага тэлевізара. Базіруецца сістэма на ЭВМ — ЕС 1022, што дазваляе павялічваць колькасць навучэнцаў ад дзесяткаў да соцень.

ДА ЗАНЯТКАЎ больш гадзіны, але ў памяшканні ўжо трое юнакоў. Адзін з іх заглядвае ў канспект, затым прабягае пальцамі па клавіятуры, звярае напісанае з графікам на экране тэлевізара. Аўдыторыя паступова запаўняецца. Пачынаюцца заняткі. Вы хочаце правесці псіхалагічны тэст-загадку? Калі ласка! Спачатку трэба азнаёміцца з правіламі вядзення дыялогу з машынай, затым увесці дадзеныя аб сабе. Зрабілі? Зараз прачытайце змест праграмы, укажыце нумар прыкладу. На экране павінен узнікнуць адказ.

Але не хапае аднаго слова — галоўнага. Успомнілі — націсніце на клавішу. Можаце прачытаць: «Вы памыліліся», патрэбна шукаць правільны адказ.

Кожнаму прадмету адпавядае свой комплекс праграм. Ужо працяглы час вядуцца заняткі па біялогіі, хіміі, фізіцы, вышэйшай матэматыцы, матэматычнай логіцы. Можна было б вывучаць і гуманітарныя прадметы. Але праходзіць час, а гуманітарыі застаюцца ў баку. У чым жа справа? Знайшлі ж «агульную мову» з машынай групы англійскай мовы...

Безумоўна, шмат можа растлумачыць выкладчык. Але пры ўмелым, творчым падыходзе галоўны вучэбны матэрыял можна выдаваць праз АТНС. У рабоце з сістэмай можна выкарыстаць яе вялікі інтэлект, яе здольнасці запамінаць і аднаўляць безліч фактычнага матэрыялу. Дыяграмы, табліцы, дыяфільмы, асобныя кінафрагменты, а то і фільмы цалкам, дэманстрацыя вопытаў, схем, чарцяжоў і шмат іншага — усё гэта дапаможа трываламу і грунтоўнаму засваенню матэрыялу, яго зрокаваму замацаванню.

Дык у чым жа справа? За методыкай выкладання, за складаннем сцэнарыяў, праграм. Але ні тым, ні другім сярод гуманітарыяў ніхто не займаецца. Нават у выпадку з прыродазнаўчымі навукамі ўсё гэта трымаецца на энтузіязме невялікай групы выкладчыкаў.

Праца педагога шмат прыбаўляе ў якасці ды і ў колькасці таксама. Выкарыстоўваючы навукова-тэхнічныя сродкі, ён здольны пракантраляваць дзеянні і адказы любога студэнта. Пры неабходнасці выкладчык з цэнтральнага дысплея можа ўмяшацца ў працэс навучання. Машына пазбаўляе студэнта ад непатрэбнай працы, пашырае яго творчы патэнцыял. АТНС заменіць выкладчыка і імгненна знойдзе памылку, ацэніць веды па спецыяльнай шкале. Машына спраўна фіксуе развагі студэнта, задае ўдакладняючыя пытанні, можа і паспрачацца. У студэнта развіваецца самастойнасць і арыгінальнасць мыслення. Выкладчык на дысплеі дапамагае студэнту мэтанакіравана засвойваць матэрыял. Нельга забываць і пра тое, што студэнт атрымлівае пры гэтым навыкі работы з даволі складанай тэхнікай. У будучым усё гэта дапаможа яму ў арганізацыі працы на вытворчасці.

Але час не чакае. Ужо патрабуюцца новыя сістэмы, больш дасканалыя.

— ТАК, напрыклад,— гаворыць старшы навуковы супрацоўнік А. І. Тарнапольскі, адзін з лаўрэатаў прэміі,— ужо зараз створана аналагічная сістэма з тэлевізарамі каляровага адлюстравання. Задачы, пастаўленыя партыяй і ўрадам па паскарэнню НТП, прад'яўляюць да распрацовак новыя патрабаванні. Ёсць у нас і новыя арыгінальныя ідэі, якія мы імкнёмся выкарыстаць у рабоце.

Але, як кажуць, працягвае А. І. Тарнапольскі, ёсць жаданне, але няма магчымасцей. Сістэма наша, як вядома, у некалькі разоў эканамічней ёй падобных. Яна была прызнана тыповай і пастаўлена на канвеер. З таго часу прайшло тры гады. За гэты перыяд у краіне створана толькі 8 спецыялізаваных аўдыторый. А аднаму нашаму універсітэту патрабуецца, як мінімум, 10 класаў АТНС. Парадокс, ды і годзе!

Але самае непрыемнае ў тым, што распрацоўка з часам маральна старэе. Губляецца яе аўтарытэт з-за маруднасці серыйнай вытворчасці. Але і гэта яшчэ не ўсё. Стварэнне адзінкавых экземпляраў толькі нашымі сіламі патрабуе вялікіх намаганняў, затрат часу.

У нас няма цеснай сувязі з навукова-метадычнымі і вытворчымі аб'яднаннямі. У выніку атрымліваецца, што недахопы ўкаранення і асваення новых распрацовак кладуцца цяжарам на плечы вучоных, даследчыкаў, канструктараў.

Задачы, пастаўленыя часам перад вучонымі, ускладняюцца. Ім належыць стварыць цэлы шэраг аўтаматызаваных сістэм. ВНУ, тэхнікумы, школы, інстытуты павышэння кваліфікацыі неадкладна чакаюць укаранення гэтай распрацоўкі. Такім чынам, хаця АТНС і здольна значна дапамагчы студэнту і выкладчыку, у цяперашні час ёй самой патрэбна дапамога. Патрэбна тэрміновая серыйная вытворчасць: ад гэтага будзе залежаць, якія спецыялісты прыйдуць з універсітэта ў народную гаспадарку.

А. БЕЛАВУС.

НА ЗДЫМКУ: асістэнт кафедры кібернетыкі Вячаслаў Міхайлавіч Малафееў рыхтуе сістэму кіравання прамысловым робатам для лабараторнага практыкума.

Фота А. ВАЛОШЫНА.

САЦЫЯЛЬНЫ ЗАКАЗ ЧАСУ

ПАСЯБРАВАЛІ З... ЭКАНОМІЯЙ

ЩІВЕДАЕЦЕ вы народную прымаўку: «Не прыходам багацеюць, а разумным расходам»? Згадзіцеся, яна і павучае, і папярэджвае нас, што гаспадарчыя адносіны да прыродных рэсурсаў — гэта адзін з унутраных рэзерваў нашай эканомікі.

Як жа навучыцца эканоміць? Гэта пытанне даўно турбуе вучоных, вынаходнікаў, эканамістаў, рабочых і кіраўнікоў прадпрыемстваў.

Праблема эканоміі паліва на аўтамабільным транспарце стаіць асабліва востра. І майстэрства шафёра, і тэхнічны стан аўтамабіля, і рацыянальны выбар шляху — вось тыя складаемыя, ад якіх залежыць расход паліва.

У 1981 годзе НВА «Аўтатранстэхніка» звярнулася на кафедру ядзернай фізікі БДУ імя У. І. Леніна і прапанавала вучоным распрацаваць прыладу для рэгуліроўкі расходу паліва аўтамабільным транспартам.

Кіраўнік групы маладых вучоных кафедры ядзернай фізікі Анатоль Яўгенавіч Прахін з захапленнем расказвае аб стварэнні гэтай прылады, якую назвалі расходамерам.

Гэта была напружаная, руплівая праца. І вось у 1983 годзе аб'яднанню «Аўтатранстэхніка» была прапанавана прылада, створаная на аснове асваення метаду магнітнага рэзанансу. Механічная частка яе была выраблена на доследным прадпрыемстве.

Адзначым асноўныя характарыстыкі гэтай прылады: высокая дакладнасць вымярэння пры малых колькасцях расходу паліва, вялікі дыяпазон вымяраемых расходаў, надзейнасць, звязаная з адсутнасцю рухомых дэталяў. Анатоль Яўгенавіч падрабязна знаёміць з прыладай:

— Яна можа вымяраць расход паліва ад 3,5 да 50 літраў у гадзіну. Што датычыць прымянення, то яна ў сілах рэгуляваць паліўную сістэму на пастах дыягностыкі і станцыях тэхнічнага абслугоўвання.

Выпрабаванні прылады праводзіліся ў два этапы. Першы — у лабараторных умовах, другі — у эксплуатацыі на аўтакамбінатах № 4 і № 6 горада Мінска.

— На 18 з 20 аўтамабіляў да рэгуліроўкі рухавікоў расход паліва быў значна вышэй нормы, і толькі на двух адпавядаў ёй,— працягвае размову А. Я. Прахін.— А выкарыстанне расходамера дазволіла адрэгуляваць карбюратары з улікам індывідуальных асаблівасцей і тэхнічнага стану рухавіка.

Эфектыўнасць гэтай рэгуліроўкі відавочная. Расход паліва на найменшых абаротах халастога ходу не перавысіў норму — 3,5 літра ў гадзіну. У тым ліку на 17 аўтамабілях расход быў ніжэй нормы і знаходзіўся ў межах 2,5—3,4 літра ў гадзіну, а на чатырох ён быў зніжаны да 2,5 літра ў гадзіну. Адзначым, што рухавікі пасажырскага транспарту працуюць у рэжымах халастога ходу 50 працэнтаў часу, а грузавога — 20 працэнтаў.

Рэгуліроўка падачы паліва новым прыстасаваннем дае 17 працэнтаў яго эканоміі. Такі эфект ад укаранення навінкі на вытворчасці.

З. АСТАПЮК.

КАМП'ЮТЭРЫЗАЦЫЯ ШКОЛЫ

Сааўтар-ЭВМ

ВАЖНЕЙШЫМ фактарам паскарэння навукова-тэхнічнага прагрэсу ў краіне павінна стаць усебаковае і глыбокае авалоданне моладдзю вылічальнай тэхнікай. З 1 верасня мінулага года ва ўсіх школах уведзены курс «Асновы інфарматыкі і вылічальнай тэхнікі».

З ЭВМ НА «ТЫ»

УЯВІЦЕ сабе такі малюнак: дзяўчынка-першакласніца ўпэўнена націскае на клавішы ЭВМ. Згадзіцеся, раней такое «сяброўства» было б толькі фантастыкай. Цяпер жа гэта рэальнасць. Асаблівае месца займае ЭВМ сёння ў школе. З яе дапамогай вучні могуць атрымаць неабходную даведку, правесці эксперыменты па хіміі, фізіцы, вывучыць замежную мову. І нават згуляць з ЭВМ у шахматы. Для школьнікаў малодшых класаў распрацаваны мініяцюрны трэнажор. Пры дапамозе сінтэзатара вучні могуць самастойна авалодаць мовай. Для таго, каб быць з ЭВМ на «ты», неабходны веды. Не проста веды па гісторыі «электронікі» і яе будове. Неабходна авалодаць мовай і прыёмамі праграмiравання. Асноўнае патрабаванне да камп'ютэрнай адукацыі — падрыхтоўка вучняў да выкарыстання вылічальнай тэхнікі ў іх далейшай практычнай дзейнасці. Іменна з гэтай мэтай у 1960 годзе ў якасці эксперыменту прадмет «Асновы інфарматыкі і вылічальнай тэхнікі» быў уведзены ў праграму адной з маскоўскіх школ. Потым школы-эксперыментатары з'явіліся ў розных гарадах і сталіцах рэспублік.

ВУЧАЦЦА НАСТАЎНІКІ

АЎДЫТОРЫЯ гэта не падобная на звычайную студэнцкую. Не такая шумная. Людзі сабраліся тут больш сталыя, разважлівыя. Уважліва слухалі лекцыі, старанна занатоўвалі ў сшыткі. Потым задавалі пытанні, цікавіліся рознымі навінкамі.

Заняткі па «Асновах інфарматыкі і вылічальнай тэхнікі» праводзіліся для настаўнікаў фізікі і матэматыкі школ горада Мінска на базе нашага універсітэта. Мэта іх — даць асноўныя паняцці выкладання гэтай дысцыпліны ў школе, навучыць педагогаў рабоце з ЭВМ.

На занятках не толькі слухалі тэарэтычны курс, але і працавалі ў лабараторыях і дысплейных класах універсітэта. Былі і заданні для кожнага настаўніка.

У час летніх канікулаў на базе БДУ прайшлі падрыхтоўку па інфарматыцы больш чым 500 настаўнікаў, дырэктары мінскіх школ, настаўнікі — біёлагі, літаратары, географы.

ПРАБЛЕМЫ... ШТО ЗА ГЭТЫМ?

«І ТУТ ПРАБЛЕМЫ?» — здзіваюцца многія. Здаецца, уся ўвага накіравана на камп'ютэрызацыю. Але дзе ж іх не бывае — махнуць рукой іншыя.

Бываюць, але... могуць і не быць...

У час маёй размовы з В. С. Раманчыкам на кафедру лічбавых метадаў праграмiравання зазірнуў калега з Азербайджанскага універсітэта. Знаходзіўся на стажыроўцы ў Мінску. Адбыўся наступны дыялог:

— Я да вас зноў з просьбай. Неабходна метадычная літаратура па «Асновах інфарматыкі».

— Нічым дапамагчы не магу, — развёў рукамі Валерый Станіслававіч.— Яшчэ не размножана. Вось, бачыце, напісана, а размножыць не можам. У бліжэйшы час вышлем.

Не менш важнае пытанне — падрыхтоўка будучых настаўнікаў па інфарматыцы ва універсітэце. Тут таксама ёсць свае праблемы.

На жаль, не абсталяваны ў нас яшчэ на мехмаце, ФПМ класы інфарматыкі і малых вылічальных машын. ЭВМ ёсць, але яны раскіданы па розных лабараторыях факультэтаў. Не хапае памяшканняў. Нават групу студэнтаў у 10 чалавек няма дзе пасадзіць на практычных занятках.

Праблемы ёсць, і вырашыць іх патрэбна хутчэй. Час ідзе. І адлік яго таксама вядзецца па электроннаму гадзінніку. Патрэбна спяшацца. Будучае — за ЭВМ!

Н. ТРУБЧЫК.

БЕЛАРУСКІ ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

аб'яўляе прыём студэнтаў на 1986 — 1987 навучальны год

НА ДЗЁННАЕ НАВУЧАННЕ ПА СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЯХ:

беларуская мова і літаратура і руская мова і літаратура, журналістыка, руская мова і літаратура, гісторыя, правазнаўства, палітычная эканомія, філасофія, гісторыя КПСС, матэматыка (педагагічнае і вытворчае аддзяленні), прыкладная матэматыка, біялогія, геаграфія (педагагічнае і вытворчае аддзяленні), хімія (педагагічнае і вытворчае аддзяленні), фізіка (педагагічнае і вытворчае аддзяленні), радыёфізіка і электроніка.

НА ВЯЧЭРНЯЕ НАВУЧАННЕ ПА СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЯХ:

хімія, фізіка, радыёфізіка і электроніка, прыкладная матэматыка.

НА ЗАВОЧНАЕ НАВУЧАННЕ ПА СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЯХ:

беларуская мова і літаратура і руская мова і літаратура, руская мова і літаратура, правазнаўства, гісторыя, журналістыка, біялогія, геаграфія, матэматыка.

Універсітэт рыхтуе высокакваліфікаваных спецыялістаў для розных галін народнай гаспадаркі, навукі і культуры, выкладчыкаў вышэйшых, сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў і сярэдніх агульнаадукацыйных школ.

Заявы прымаюцца: на дзённае навучанне — з 1 па 31 ліпеня, на вячэрняе навучанне — з 20 чэрвеня па 31 ліпеня, на завочнае навучанне — з 20 красавіка па 31 мая; уступныя экзамены на дзённае і вячэрняе навучанне — з 1 па 20 жніўня, на завочнае навучанне — з 1 па 20 чэрвеня.

На навучанне па спецыяльнасцях філасофія, палітычная эканомія, гісторыя КПСС прыём праводзіцца, як правіла, з ліку асоб, якія маюць працоўны і жыццёвы вопыт, станоўча зарэкамендавалі сябе ў грамадскім жыцці, пераважна членаў і кандыдатаў у члены КПСС, а таксама камсамольскіх актывістаў, якія праявілі цікавасць да вывучэння грамадска-палітычных навук.

На спецыяльнасці журналістыка і правазнаўства прымаюцца, як правіла, асобы, якія маюць стаж практычнай работы не менш двух гадоў і станоўча праявілі сябе ў грамадска-палітычнай рабоце. Пры гэтым на спецыяльнасць журналістыка прымаюцца асобы, якія праявілі здольнасці да літаратурнай дзейнасці і паспяхова прайшлі творчы конкурс. Творчы конкурс праводзіцца (па выкліку) з 15 ліпеня па 25 ліпеня на дзённую форму навучання і з 31 мая па 5 чэрвеня на завочнае навучанне. Матэрыялы на конкурс разам з неабходнымі дакументамі для паступлення на дзённую форму навучання прымаюца з 1 чэрвеня па 15 ліпеня, на завочную форму — па 31 мая. Асобы, якія паспяхова прайшлі творчы конкурс, дапускаюцца да ўступных экзаменаў.

Паступаючыя падаюць заяву на імя рэктара па адзінай форме (дадатак № 2 да Правілаў прыёму ў ВНУ). Паступаючыя на дзённую форму навучання на спецыяльнасці фізіка, матэматыка, хімія і геаграфія ў заяве ўказваюць аддзяленне — вытворчае або педагагічнае. Да заявы дадаюцца: дакумент аб сярэдняй адукацыі ў арыгінале; характарыстыка для паступлення ў ВНУ з апошняга месца работы або вучобы, выдадзеная партыйнымі, камсамольскімі, прафсаюзнымі і іншымі грамадскімі арганізацыямі, кіраўнікамі прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў, заверана пячаткай (прадстаўленне характарыстыкі звольненым у запас ваеннаслужачым не абавязкова); выпіска з працоўнай кніжкі або кніжкі калгасніка, заверана адміністрацыяй; медыцынская даведка па форме 086/у; шэсць фотакартак для дакументаў памерам 3×4 см.

Паступаючыя ва універсітэт здаюць экзамены ў залежнасці ад выбранай спецыяльнасці па дысцыплінах:

на спецыяльнасць беларуская мова і літаратура і руская мова і літаратура — па рускай мове і літаратуры (сачыненне), грамадазнаўству (вусна), беларускай мове і літаратуры (вусна);

на спецыяльнасць руская мова і літаратура — па рускай мове і літаратуры (сачыненне), грамадазнаўству (вусна), рускай мове і літаратуры (вусна);

на спецыяльнасць журналістыка — па рускай мове і літаратуры (сачыненне), грамадазнаўству (вусна), рускай мове і літаратуры (вусна) (па жаданню абітурыента экзамены па рускай мове і літаратуры могуць быць заменены аналагічнымі экзаменамі па беларускай мове і літаратуры);

на спецыяльнасці гісторыя, гісторыя КПСС, філасофія, правазнаўства — па рускай мове і літаратуры (сачыненне), грамадазнаўству (вусна), гісторыі СССР (вусна);

на спецыяльнасці матэматыка, прыкладная матэматыка — па рускай мове і літаратуры (сачыненне), матэматыцы (вусна і пісьмова);

на спецыяльнасці фізіка, радыёфізіка і электроніка — па рускай мове і літаратуры (сачыненне), матэматыцы (пісьмова), фізіцы (вусна);

на спецыяльнасць хімія — па рускай мове і літаратуры (сачыненне), матэматыцы (пісьмова), хіміі (вусна);

на спецыяльнасць біялогія — па рускай мове і літаратуры (сачыненне), біялогіі (вусна), хіміі (вусна);

на спецыяльнасць геаграфія — па рускай мове і літаратуры (сачыненне), матэматыцы (пісьмова), геаграфіі (вусна).

Паступаючыя ва універсітэт на спецыяльнасці гісторыя КПСС, гісторыя, філасофія, правазнаўства, фізіка, матэматыка, прыкладная матэматыка, радыёфізіка і электроніка, хімія, біялогія, геаграфія, палітычная эканомія замест экзаменаў па рускай мове і літаратуры (сачыненне) могуць (па жаданню) здаваць экзамен па беларускай мове і літаратуры (сачыненне).

ЗАЎВАГА: узнагароджаныя па заканчэнні сярэдняй школы залатым (сярэбраным) медалём, скончыўшыя сярэднюю спецыяльную навучальную ўстанову або сярэдняе прафесійна-тэхнічнае вучылішча з дыпломам з адзнакай здаюць адзін экзамен, а іменна: паступаючыя на спецыяльнасць беларуская мова і літаратура і руская мова і літаратура — па беларускай мове і літаратуры (вусна); на спецыяльнасць руская мова і літаратура — па рускай мове і літаратуры (вусна); на спецыяльнасць журналістыка пасля праходжання творчага конкурсу — па рускай мове і літаратуры (вусна) або (па жаданню паступаючага) па беларускай мове і літаратуры (вусна); на спецыяльнасці матэматыка, прыкладная матэматыка — па матэматыцы (вусна); на спецыяльнасці фізіка, радыёфізіка і электроніка — па фізіцы (вусна); на спецыяльнасць хімія — па матэматыцы (пісьмова); на спецыяльнасць біялогія — па біялогіі (вусна); на спецыяльнасць геаграфія — па геаграфіі (вусна); на спецыяльнасць гісторыя — па гісторыі СССР (вусна); на спецыяльнасці правазнаўства, філасофія, гісторыя КПСС, палітычная эканомія — па грамадазнаўству (вусна). Пры атрыманні ацэнкі «пяць» яны вызваляюцца ад здачы астатніх экзаменаў, а пры атрыманні ацэнкі «чатыры» або «тры» — здаюць астатнія экзамены.

На асоб, якія скончылі з дыпломам з адзнакай сярэднія прафесійна-тэхнічныя вучылішчы на базе сярэдняй адукацыі, указаны парадак распаўсюджваецца пры паступленні на спецыяльнасці, якія адпавядаюць атрыманым прафесіям.

На навучанне без адрыву ад вытворчасці ўказаны ў заўвазе парадак распаўсюджваецца на асоб, якія маюць стаж практычнай работы па выбранай у ВНУ або блізкай спецыяльнасці не менш года і якія працуюць у цяперашні час па гэтай спецыяльнасці, а таксама на асоб, якія скончылі сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы або сярэдняе прафесійна-тэхнічныя вучылішчы з дыпломам з адзнакай і якія працуюць па атрыманай спецыяльнасці, пры паступленні на адпаведную або блізкую спецыяльнасць.

Паступаючыя на дзённую і вячэрнюю формы навучання па спецыяльнасцях прыкладная матэматыка, фізіка, хімія; на дзённую і завочную форму навучання па спецыяльнасці матэматыка, якія не маюць у дакументе аб сярэдняй адукацыі ацэнак «здавальняюча», паспяхова прайшлі прафарыентацыйную гутарку (толькі для дзённай формы навучання) і здалі два экзамены па прафілюючых дысцыплінах пры паступленні на спецыяльнасці матэматыка і прыкладная матэматыка — па матэматыцы (пісьмова і вусна); на спецыяльнасць фізіка — па матэматыцы (пісьмова) і фізіцы (вусна); на спецыяльнасць хімія — па матэматыцы (пісьмова) і па хіміі (вусна), і набраўшыя такім чынам не менш чым 9 балаў, вызваляюцца ад здачы экзаменаў па рускай мове і літаратуры.

Уступныя экзамены праводзяцца па праграмах, складзеных у адпаведнасці з вучэбнымі праграмамі сярэдняй агульнаадукацыйнай школы і зацверджанымі Міністэрствам вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР.

Прафарыентацыйныя камісіі працуюць з 21 па 31 ліпеня. Паступаючыя на факультэт журналістыкі праходзяць прафарыентацыйную гутарку пасля творчага конкурсу.

Для паступаючых на вячэрнюю і завочную формы навучання прафарыентацыйная гутарка не праводзіцца.

Яўка на прафарыентацыйную гутарку і на экзамены — па выкліку.

Іншагароднія, паступаючыя на дзённае навучанне, на час уступных экзаменаў забяспечваюцца інтэрнатам.

Дакументы высылаць па адрасу: 220080, г. Мінск, Ленінскі праспект, 4, Белдзяржуніверсітэт імя У. І. Леніна. Прыёмнай камісіі (указаць спецыяльнасць).

РЭКТАРАТ.

ПРЫЗВАННЕ+ПРАЦА+ ТВОРЧАСЦЬ

БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТ імя У. І. Леніна гатовы прыняць новае папаўненне. Перад прыёмнай камісіяй пастаўлена задача адабраць найбольш здольную, дастойную і таленавітую моладзь з ліку выпускнікоў сярэдніх школ, тэхнікумаў і прафесійна-тэхнічных вучылішчаў. Для гэтай мэты на факультэтах сфарміраваны экзаменацыйныя камісіі. Прыём экзаменаў даручаны вопытным педагогам, якія добра ведаюць праграму сярэдняй школы і здольны ў абставінах ўзаемнага даверу вызначыць узровень ведаў абітурыента. Кожны прэтэндэнт на высокае званне студэнта павінен паспяхова прайсці конкурс. Само слова «конкурс» прадугледжвае, што патрэбны не толькі веды, але і ўменне іх выкладаць. Выказаць упэўнена, дакладна, перакананча. Уменне спакойна разважаць, а калі патрэбна, і смела даказваць — цэніцца асабліва. Імкненне спехам «вымавіць» усё, што прыходзіць на розум — насцярожвае. Дадатковыя пытанні, як правіла, паступаюць тады, калі ў адказе няма галоўнага зместу, ці калі высвятляецца зубрэнне, ці выкладчык жадае ўдакладніць ваш адказ. У гэтым выпадку, адказваючы на пытанне, трэба спачатку падумаць, у чым сутнасць пытання, чаму яно зададзена, а потым ужо і адказваць.

Як вядома, зацверджаны новыя Правілы прыёму ў вышэйшыя навучальныя ўстановы краіны. Прапануемая сістэма не з'яўляецца чымсьці прынцыпова новым. Як і раней, абітурыенты будуць здаваць конкурсныя экзамены, але не па чатырох, а па трох прадметах. Узнагароджаныя па заканчэнні сярэдняй школы залатым (сярэбраным) медалём, скончыўшыя сярэднюю спецыяльную ўстанову ці сярэдняе прафесійна-тэхнічнае вучылішча здаюць адзін экзамен па спецыяльнасці. Пры атрыманні адзнакі «пяць» яны вызваляюцца ад астатніх экзаменаў. Асобы, якія не маюць у дакументе аб сярэдняй адукацыі ацэнак «здавальняюча», на механіка-матэматычны, хімічны, фізічны факультэты і на факультэт прыкладной матэматыкі Белдзяржуніверсітэта будуць здаваць два ўступныя экзамены. Набраўшыя пры гэтым не менш 9 балаў вызваляюцца ад трэцяга экзамена.

Новае ў Правілах прыёму заключаецца ў наступным. Сума балаў, набраных на ўступных экзаменах, з'яўляецца неабходнай, але не дастатковай умовай прыёму ва універсітэт для абітурыентаў, якія здаюць усе экзамены. Да балаў, атрыманых на экзаменах, будуць дадавацца балы, налічаныя абітурыентам па рэзультатах прафарыентацыйнай гутаркі. Для налічэння дадатковых балаў на кожным факультэце створаны прафарыентацыйныя камісіі. Камісія будзе праводзіць гутарку па меры паступлення дакументаў да пачатку ўступных экзаменаў.

Няма неабходнасці тлумачыць, як важна абітурыенту выбраць факультэт і адшукаць прымяненне сваім сілам па душы! Мэта гутаркі — дапамагчы абітурыенту ў выбары прафесіі, якая найбольш адпавядае яго схільнасцям і ўзроўню падрыхтоўкі. Па-другое, ацаніць поспехі абітурыента ў прафесійна-накіраванай працы, гэта значыць налічыць балы за працу і творчасць.

Хацелася б падкрэсліць, што ацэньваюцца поспехі ў працы і творчасці ў галіне, адпаведнай профілю спецыяльнасці. Гэта ацэнка будзе выстаўляцца ў балах ад нуля да трох. Такім чынам, частка абітурыентаў, якія праявілі сябе ў галіне выбранай прафесіі, яшчэ да пачатку ўступных экзаменаў, атрымае пэўныя перавагі. У гутарцы закладзены новы, больш дынамічны і эфектыўны падыход у рашэнні праблемы якаснага набору будучых першакурснікаў.

Указаныя тры балы атрымаюць асобы, якія маюць ганаровыя званні заслужаных работнікаў галін народнай гаспадаркі, заслужаныя вынаходнікі і рацыяналізатары, узнагароджаныя знакамі «Вынаходнік СССР», «Пераможца Усесаюзнага сацыялістычнага спаборніцтва», лаўрэаты прэмій Ленінскага камсамола, выпускнікі сярэдніх спецыяльных і прафесійна-тэхнічных вучылішчаў, якія адпрацавалі адпаведны тэрмін і паступаюць на блізкія спецыяльнасці.

Трыма баламі могуць быць ацэнены поспехі прызёраў усесаюзных і рэспубліканскіх конкурсаў, аглядаў і алімпіяд, удзельнікаў ВДНГ СССР (медаль выстаўкі), асоб, якія маюць аўтарскія пасведчанні на вынаходніцтва.

Два дадатковыя балы атрымаюць ваеннаслужачыя, звольненыя ў запас; абітурыенты, якія маюць стаж практычнай работы па выбранай ці блізкай спецыяльнасці не менш 2-х гадоў; пастаянна пражываючыя ў сельскай мясцовасці пры паступленні на педагагічныя аддзяленні механіка-матэматычнага, фізічнага, хімічнага, геаграфічнага, філалагічнага, біялагічнага і гістарычнага факультэтаў Белдзяржуніверсітэта; паступаючыя на педагагічныя аддзяленні названых факультэтаў па рэкамендацыі педагагічных саветаў школ, органаў народнай асветы, працоўных калектываў, гарадскіх і раённых камітэтаў камсамола.

Двума баламі могуць быць ацэнены поспехі абітурыентаў, узнагароджаных па заканчэнні сярэдняй школы залатым (сярэбраным) медалём; асоб, якія скончылі з добрымі і выдатнымі ацэнкамі спецыялізаваныя школы, спецыялізаваныя школы юных (пры БДУ і АН БССР); прызёраў рэгіянальных і абласных алімпіяд, конкурсаў, аглядаў, навукова-тэхнічных і навукова-прафесійных алімпіяд БДУ імя У. І. Леніна; асоб, якія маюць тры і болей рацыяналізатарскіх прапаноў.

Адзін бал можа быць налічаны асобам, якія маюць стаж практычнай работы не менш двух гадоў ці іншыя поспехі ў працы, прафесійна накіраванай творчасці ці творчых спаборніцтвах па прафілюючых для дадзенага факультэта дысцыплінах (граматы па прафілюючых для дадзенага факультэта прадметах; пераможцам гарадскіх і раённых алімпіяд і г. д.), а таксама асобам, якія скончылі ВПК па выбранай спецыяльнасці.

Аналіз уступных экзаменаў дазваляе знайсці шэраг агульных, характэрных для абітурыентаў недахопаў. Хацелася б, зыходзячы з былога вопыту, перасцерагчы, наколькі гэта магчыма, абітурыентаў ад паўтарэння чужых памылак. Найперш за ўсё экзамен — не латарэя. Вопыт тых, хто паступіў у БДУ, гаворыць аб тым, што уступныя экзамены, як і школьныя выпускныя, з дастатковай імавернасцю адлюстроўваюць сапраўдныя веды вучняў. Як паказвае вопыт мінулага года, многія абітурыенты на конкурсных экзаменах «зрэзаліся», гэта значыць паказалі нізкі ўзровень сваіх ведаў не таму, што да іх былі нейкія завышаныя патрабаванні, але ў сілу недастатковых ведаў. Былі і такія, хто падаваў дакументы «за кампанію», а хто і проста, каб патрэніравацца. У гэтай сувязі хацеў бы яшчэ раз падкрэсліць, што аб завышаных патрабаваннях не можа быць і гутаркі, бо ў экзаменацыйных білетах няма ніводнага слова, якое б выходзіла за межы школьнай праграмы.

Уступныя экзамены — гэта перашкода. Экзаменацыйную камісію, калі хочаце, трэба перамагчы. Перамагчы ведамі, каб з законным гонарам вучыцца далей. Лозунг «Толькі б паступіць!» шкодны найперш за ўсё самім абітурыентам. Частка з іх «правальваецца» на экзаменах, а паступіўшыя ўжо на першых курсах не спраўляюцца з праграмай навучання і кідаюць вучобу.

На наш погляд, фармалізм у засваенні ведаў з'яўляецца асноўнай прычынай нізкіх ацэнак на ўступных экзаменах. Некаторыя абітурыенты (іншы раз медалісты) адказваюць жвава, але як магнітафон — могуць паўтарыць толькі старонкі падручніка.

Нават адлічаныя студэнты маглі б утрымацца і стаць, кім жадалі, каб мелі звычку самастойнай работы. Самастойная работа — вораг зубрэння.

Сучаснае развіццё народнай гаспадаркі, дасягненні навукова-тэхнічнай рэвалюцыі патрабуюць змен і удасканалення праграм ВНУ. Цяперашні спецыяліст павінен грунтоўна валодаць сучаснай навукай і яе метадалогіяй, павінен умець ставіць і рашаць прынцыпова новыя навукова-вытворчыя задачы. За пяць гадоў толькі сіламі універсітэта такога спецыяліста не створыш, калі першакурснік не быў гатовы да гэтага. Вось чаму сёння так важна паглыбленая прафесійная арыентацыя. Дадатковыя веды, атрыманыя на ўроках і пазакласных занятках, ствараюць грунтоўны запас трываласці будучым студэнтам. Падрыхтаваныя і прафесійна арыентаваныя абітурыенты, атрымаўшы права на вышэйшую адукацыю, змогуць у пэўнай ступені ўнесці свой уклад у паскарэнне тэмпаў навукова-тэхнічнага прагрэсу. Карацей, сёння патрэбны такі абітурыент, які адчувае пульс часу.

П. САЛАЎ,
дацэнт кафедры электронных матэматычных машын, намеснік адказнага сакратара прыёмнай камісіі.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Мінская паліграфічная фабрыка «Красная звезда» МВПА імя Я. Коласа.

15 мая 1986 г.

АТ 19126. Зак. 604.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 72-73. ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ.